**Спіс крыніц**

1. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. — Т. 1: Акапэла – Куцця / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў і інш. — Мн. : БелЭн, 2005. — 768 с.
2. *Фядосік, А. С.* Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; навуковы рэдактар К. П. Кабашнікаў. — Мінск: Бел. Навука, 2001. — 420 с.

***С. С. Казляк***
*Навуковы кіраўнік – А. В. Солахаў*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЗАЙМАЛЬНАГА МАТЭРЫЯЛУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТЭМЫ «РАЗРАДЫ ПРЫМЕТНІКАЎ»

Адной з важнейшых тэм пры вывучэнні раздзела «Прыметнік» з'яўляецца тэма «Разрады прыметнікаў па значэнні». Каб вучні добра засвоілі гэтую тэму і маглі лёгка прымяняць атрыманыя веды на практыцы, настаўніку неабходна не толькі зацікавіць вучняў тэмай, але і выклікаць жаданне працаваць над ёй. Для рэалізацыі такой важнай задачы, на нашу думку, неабходна шырэй выкарыстоўваць займальны матэрыял, які здольны актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў і зацікавіць іх тэмай ўрока.

Перад пачаткам вывучэння новай тэмы мэтазгодна правесці **віктарыну** па пройдзенай тэме, якая выявіць агульныя веды вучняў па прыметніку:

1. Якая самастойная часціна мовы абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні *які? чый?* (Прыметнік.)
2. Назавіце граматычную катэгорыю, па якой змяняецца прыметнік, але не змяняецца назоўнік. (Род.)
3. Калі прыметнікі «губляюць» род? (У множным ліку)
4. Якім членам сказа бываюць прыметнікі? (Азначэннем, выказнікам.)

Асаблівай увагі патрабуюць да сябе якасныя прыметнікі, таму што яны найчасцей ужываюцца ў маўленні і маюць нацыянальную адметнасць пры ўтварэнні ступеняў параўнання. Пры рабоце з правілам падручніка вучні знаёмяцца з прыметамі, якія могуць абазначаць якасныя прыметнікі, і з уласцівасцямі, якімі яны валодаюць: утвараюць ступені параўнання, могуць паўтарацца, могуць спалучацца са словамі *вельмі, дужа*, маюць форму ацэнкі [3, с. 33]. Гэтыя веды вучні набываюць тэарэтычна, але патрэбна прымяніць іх на практыцы, выконваючы заданні настаўніка, умець вылучаць у тэксце якасныя прыметнікі і адрозніваць іх ад іншых разрадаў прыметнікаў. Для гэтага ў падручніку існуе значная колькасць разнастайных практыкаванняў, але мы прапануем гульню **«Сакаліны зрок»**, у якой, гуляючы, вучні «адшукваюць» у прапанаваным вершаваным тэксце якасныя прыметнікі. І пераможа ў гульні той, хто правільна прыменіць тэарэтычныя веды на практыцы. Актывізаваць мысліцельную дзейнасць і папоўніць слоўнікавы запас вучняў дапаможа гульня **«Хто больш?»**: адна каманда падбірае якасныя прыметнікі да назоўніка *снег*, другая – да назоўніка *кветка*, трэцяя – да назоўніка *сонца*.

Пры вывучэнні тэмы «Якасныя прыметнікі» настаўнік знаёміць вучняў з новымі паняццямі: поўныя і кароткія прыметнікі. З дапамогай падручніка вучні пазнаёмяцца з асаблівасцямі поўных і кароткіх прыметнікаў, а мы прапануем цікавую інфармацыю з гісторыі кароткіх прыметнікаў **"Ці ведаеце вы, што…"**:

…у старажытныя часы кароткія прыметнікі з'яўляліся асноўнымі ў мове? Яны былі ўласцівы якасным, адносным і прыналежным прыметнікам і ўжываліся ў ролі выказніка і азначэння. Выконваючы ролю азначэння, кароткія прыметнікі скланяліся, як назоўнікі: прыметнікі мужчынскага і ніякага роду – як назоўнікі 2-га скланення (*добрь* як *стол, добро* як *ведро*), жаночага роду – як назоўнікі 1-га скланення (*добра* як *гора*).

… поўныя прыметнікі ўзніклі ў мове пазней? Утварыліся яны шляхам спалучэння кароткіх прыметнікаў і ўказальных займеннікаў *и, я, е* (мужчынскі род: *новъ → новъи→ новыи → новы*; жаночы род: *нова → новая*; ніякі род: *ново → новае*).

… страціўшы здольнасць выступаць у ролі азначэння, кароткія прыметнікі перасталі скланяцца? У сучаснай беларускай мове яны ўжываюцца вельмі рэдка і змяняюцца толькі па ліках, а ў адзіночным ліку – і па родах.

Гэту інфармацыю можна выкарыстаць як напачатку знаёмства з гэтым пытаннем для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, так і напрыканцы, падагульняючы веды вучняў па дадзеным пытанні.

Адносныя прыметнікі маюць толькі поўную форму. Прымета, выражаная імі праз адносіны да іншага прадмета, нязменная, таму яны не маюць формаў ацэнкі і ступеняў параўнання. Магчыма, вучні не вельмі дакладна разумеюць сутнасць тэрміна «адносныя прыметнікі», таму варта з апорай на жыццёвы вопыт шасцікласнікаў растлумачыць сэнс паняцця «адносіны». Вучні ведаюць, што тыя або іншыя прадметы або рэчы могуць быць зроблены з рознага матэрыялу. Напрыклад, кубак можа быць пластмасавы, г. зн. зроблены з пластмасы, мае сувязь з пластмасай; можа быць гліняны (сувязь з глінай), фарфоравы (сувязь з фарфорам) і інш. Такая сувязь аднаго прадмета з другім называецца адносінамі. Таму прыметнікі, якія выражаюць прыметы прадметаў паводле іх адносін да іншых прадметаў, называюцца адноснымі [2, с. 70]. Каб вучні добра ўсвядомілі адметнасць сэнсу адносных прыметнікаў, варта прапанаваць ім ролевую гульню **"Рэдактар"**, у ходзе якой словазлучэнні "назоўнік + назоўнік" патрэбна замяніць на словазлучэнні "прыметнік + назоўнік".

Прыналежныя прыметнікі больш, чым адносныя, вызначаюцца спецыфікай свайго ўтварэння і ўжывання ў беларускай мове: *маміны туфлі, сынаў здымак, бабулін кіёк, дзядулевы казкі* [3, с. 38]. Таму важна, каб правілы ўтварэння прыналежных прыметнікаў і іх правапіс вучні засвоілі добра, інакш будуць дапускаць граматычныя і арфаграфічныя памылкі. Для гэтага мы прапануем такую гульню як **"Карэктар"**, дзе вучні ў прапанаваных словазлучэннях знаходзяць памылкі, звязаныя з утварэннем прыналежных прыметнікаў. Гэта гульня накіравана на выпрацоўку арфаграфічнай пільнасці, дапамагае лепш засвоіць тэарэтычны матэрыял па ўтварэнню прыналежных прыметнікаў і фарміруе уменне прымяняць яго на практыцы. На гэтае ж правіла цікавай для вучняў будзе задача **«Дзе ж памылка?»**: выконваючы заданне настаўніка, адзін вучань напісаў *Сашын сшытак*, другі вучань выкарыстаў словазлучэнне *Сашаў сшытак*. Хто з вучняў дапусціў памылку? У гэтым заданні вучням патрэбна супаставіць атрыманыя веды і знайсці адказ на задачу, што развівае лагічнае мысленне.

Якасным будзе на ўроку правядзенне **фізкультпаўзы**, якая накіравана на замацаванне ведаў па разрадах прыметніка: настаўнік называе словазлучэнні "прыметнік+назоўнік". Калі ў словазлучэнні прыметнік якасны, вучні прысядаюць, адносны – робяць лёгкі скачок на месцы, прыналежны – пляскаюць у далоні.

***Словазлучэнні для гульні***: *зялёная трава, беларускі народ, карысная справа, летняя ноч, мядзведжы бярлог, ліхі чалавек, мядзведжая паходка, сярэдневяковы замак, рыбакова хата, матчыны рукі, чыстае неба, хатні тэлефон, воўчы след, воўчая мараль, касмічны спутнік, сённяшняя газета, рыбіна луска*.

Не абміне настаўнік і такую з'яву, як пераход адносных і прыналежных прыметнікаў у якасныя, калі яны ў якім-небудзь выказванні або тэксце набываюць пераноснае значэнне. Раскрыўшы вучням гэтую з'яву, настаўнік прапануе ім рашыць **лінгвістычныя задачы:**

1. Чаму прыметнік *вясёлы* мае антонім (*сумны*), а прыметнік *пчаліны* яго не мае? (Прыметнік *пчаліны* адносіцца да разраду прыналежных прыметнікаў, якія абазначаюць прыналежнасць прадмета пэўнай асобе ці жывой істоце. Такі прыметнік не можа супрацьпастаўляцца другому. У антанімічныя адносіны ўступаюць словы, якія маюць значэнне якасці, стану, колькасці, часу, прасторы. Да такіх і адносіцца прыметнік *вясёлы*).

2. Ці адрозніваюцца прыметнікі у наступных парах словазлучэнняў: *воўчы след і воўчы апетыт, курынае яйцо і курыны розум, лісіная нара і лісіная хітрасць*.

Прапанаваныя задачы накіраваны на замацаванне тэмы і развіццё мыслення.

Такім чынам, выкарыстанне займальнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы актывізуе дзейнасць вучняў, дапамагае лепшаму засваенню тэарэтычнага матэрыялу, садзенічае ўзбагачэнню слоўнікавага запасу, развіццю логікі мыслення. Гуляючы, вучні не стамляюцца і глыбока засвойваюць складаныя моўныя з'явы.

**Спіс крыніц**

1 *Солахаў, А. В.* Займальны матэрыял па беларускай мове: дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / А. В. Солахаў. – 2-е выд., выпраўленае. – Мінск: Лексіс, 2007. – 176 с.

2 *Красней, В. П.* Беларуская мова ў 6-м класе: вучэб. -метад. дапам. для настаўнікаў / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. – Мінск: Нар. асвета, 2000. – 128 с.

3 *Гамеза, Л. М.* Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні прыметніка ў 6 класе / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура. – 2002. – № 4. – С. 24 – 48.

***А. А. Калеснікава***
*Навуковы кіраўнік – Г. А. Арцямёнак*
Віцебскі дзяржаўны універсітэт,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

## МОЎНАЯ АСОБА Ў ЛЮСТЭРКУ ВЕРБАЛЬНЫХ АСАЦЫЯЦЫЙ

Для сучаснай гуманітарнай навукі галоўным аб'ектам даследавання з'яўляецца чалавек як асоба, г. зн. канкрэтны чалавек, носьбіт свядомасці і мовы, які валодае складаным унутраным светам і вызначаецца спецыфічнымі адносінамі да навакольнай рэчаіснасці, свайго жыцця і жыцця грамадства. Лінгвістыку цікавіць найперш чалавек у мове і мова ў чалавеку, таму павышаная ўвага тут звяртаецца на феномен *моўнай асобы*. Гэта паняцце арганічна звязвае ў цэласны комплекс мову і культуру пэўнай этнічнай супольнасці і сёння ў значнай ступені фарміруе антрапалагічную парадыгму ў лінгвістыцы. Адным з перспектыўных шляхоў вывучэння моўнай асобы можа стаць аналіз вынікаў свабоднага асацыятыўнага эксперыменту (САЭ).

У аснову нашай працы пакладзены псіхалінгвістычны эксперымент на свабоднае асацыяванне ў форме групавога пісьмовага апытання. Удзельнікамі эксперыменту сталі 105 вучняў сярэдняй школы № 36 г. Віцебска, якім быў прапанаваны спіс з 40 слоў-стымулаў, і 300 студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, большасць з якіх вучыцца на факультэце беларускай філалогіі і культуры (апрацоўваліся адказы на 50 слоў-стымулаў). Вынікам праведзенага эксперыменту стала стварэнне "Асацыятыўнага слоўніка сучаснай моладзі", які складаецца з дзвюх частак: "Асацыятыўны слоўнік студэнта" і "Асацыятыўны слоўнік школьніка". Мэта даследавання – комплексны лінгвістычны і сацыяльна-псіхалагічны аналіз асацыятыўных палёў у моўнай свядомасці студэнтаў і школьнікаў-падлеткаў, вывучэнне на яго аснове феномена моўнай